*Алена Хмелянок*

# ФАЛЬКЛОР І ЭТНІЧНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Галоўнай складовай часкай этнакультурнай прасторы з'яўляецца фальклорная спадчына, якая на працягу стагоддзяў аб'ядноўвала этнічную супольнасць. Традыцыйныя каштоўнасці, зафіксаваныя ў творах вуснай народнай творчасці, – аснова этнічнай самасвядомасці. Народная мудрасць, сканцэнтраваная ў прыказках і прымаўках, вучыла шанаваць родную зямлю, сваю радзіму, сям'ю, выпрацоўвала правілы сямейных адносін, рацыянальнага прыродакарыстання, здаровага ладу жыцця – каштоўнасці, якія сёння называюцца агульначалавечымі.

У аснову этнічнага беларускага характару закладзена ідэя роднай зямлі як адной з найвялікшых каштоўнасцяў. Жыццё чалавека не ўяўлялася без працы на зямлі ці па-за акаляюцым яго навакольным асяроддзем. У розных жанрах фальклору антрапасацыяльны і прыродны свет з'яўляюцца асноўнымі складовымі часткамі адзінай культурной і этнічнай прасторы. У беларускіх прыказках і прымаўках зафіксаваны ашчаджальныя адносіны традыцыйнага чалавека да роднай зямлі: «Зямля – нас усіх маці: яна нас корміць, яна нас прыгорне», «Зямля багацей за ўсіх», «Зямля святая, ўсе прымае» [5, с. 51–52] і інш.

Невыпадкова, што самым першым антрапаморфным боствам, якое ўзнікла ў самым пачатку гісторычнага развіцця беларускага этнасу і замацавалася ў народным светапоглядзе, была Багіня – Маці-Зямля, яе неспасцігальная жыццятворная сіла. Каштоўнасна-акрэсленае ўспрыманне зямлі стала штрушком да ўнікнення першых рэлігійных уяўленняў і зараджэння першых культавых практык [3, с. 6–8]. Аналогіі паміж прыроднымі цыкламі і жыццём чалавека прадвызначыла сакралізацыю адносін і да роднай маці.

Расійскія даследчыкі В. Бялова, Л. Вінаградава, А. Тапаркоў і інш. падкрэслівалі, што «ўніверсальная для ўсіх славянскіх традыцый жаночая сімволіка зямлі раскрываецца праз метафару мацярынства», [2, с.316], а гэта паспрыяла збліжэнню «антычных уяўленняў з вобразам Багародзіцы» [2, с.316]. Падобны погляд на сімвалізацыю зямлі выказваў і вядомы філосаф А. С. Панарын. Ён падкрэсліваў, што «ў самім славянскім язычніцка-натуралістычным арганізме, які ўспрымае зямлю міфалагічна, падобна грэцкай Геі і Дэметры, ужо было закладзена чаканне больш радыкальнай сакралізацыі зямной маці», і менавіта яе «любіў асаблівай любоўю рускі <…> чалавек» [4, с. 325].

Пяшчотныя адносіны да зямлі абумовілі павагу да земляробства, як асноўнага занятка традыцыйнага чалавека. Сялянская праца ўспрымалася складовай часткай сусветнай гармоніі, бо, па разуменню нашых продкаў, селянін у сваіх штодзённых занятках паўтараў «стыхійную містэрыю прыроднага станаўлення», адначасова выконваючы функцыі дэміурга. Таму невыпадкова, што прасторава-часавая структура архаічнага універсума, а таксама і ход анталагічнага часу вызначаліся важнейшымі земляробчымі працамі: сяўба, выспяванне і збор ураджаю.

Як сцвярджае Т. А. Агапкіна, менавіта такі «каляндарны час міфапаэтычна набліжаецца да часу чалавечага жыцця, якое мае пачатак і канец, одно апісваецца праз другое, што ў цэлым ёсць праява антрапаморфна арыентаванай мадэлі свету і міфапаэтычнай роўнасці макра- і мікракосмасу» [1, с.650]. Несумненна, каляндарна-абрадавы комплекс беларускага фальклору, не толькі з'яўляецца энцыклапедыяй сялянскага жыцця, але і рэгулятывам, які вызначае экзістэнцыяльнае вымярэнне чалавечага быцця, – прыроднага, сацыяльнага і духоўнага адзінства.

Зямля, праца, і дабрабыт у народным светапоглядзе былі ўзаемазвязанымі паняццямі: «Зямля маці – праца бацька», «Каб не было пуста, трэба сеяць густа» [5, с. 51, 129]. Ступень авалодання працоўнымі навыкамі адыгравала вядучую ролю ў фарміраванні адносінаў грамадства да канкрэтнага чалавека: «Дрэнны ўжо той чалавек, што гаспадаркі не мае»; «У добрай гаспадыні і певень нясецца» [5, с. 187]. Абрадавая практыка ажыўляла найбольш значныя элементы калектыўнай свядомасці, што дапамагала супольнасці ўсведамляць сябе адзіным цэлым.

Беларускі фальклор пранізаны ідэяй ўсхвалення прыроды і навакольнага асяроддзя як найбольш выразных праяў ідэі сакральнасці зямлі і ўсіх яе жыхароў. Практычна ва ўсіх фальклорных жанрах растанне з ёю ўспрымаецца як выпадзенне з сусветнай касмічнай гармоніі, што можа мець негатыўныя наступствы для грамадства ў цэлым. Таму зямля разумелася не проста як нацыянальнае і культурнае багацце, а як этнічная святыня. Яна ўяўляла сабою гарант самаідэнтыфікацыі чалавека.

Прырода з'яўлялася носьбітам патрыятычных пачуццяў. «Родная зямелька, як зморанаму пасцелька» [4, с. 287], казалі нашы продкі. Яна была не толькі жыццёвай прасторай грамадства, але і гарантам адзінства супольнасці ў кантэкстце гістарычнага развіцця этнасу. Зямля атаясамлівалася з месцам жыцця продкаў і разумелася месцам гістарычнай сувязі пакаленняў, сімвалам гістарычнай і культурнай еднасці роду.

Этнічная самасвядомасць праяўляецца таксама і праз унутрысямейныя адносіны. На працягу стагоддзяў беларускі народ выпрацоўваў сваю сістэму сямейных каштоўнасцяў, якія былі скіраваны на ўмацаванне сям'і і грамадства ўвогуле. Усеагульнай павагай карысталася тыя сем'і, якія жылі ціха і спакойна. Пра такую сям'ю казалі: «Сам бог рад, калі ў сям'і лад», «Нашто клад, калі ў сям'і лад», «Калі ў хаце ціха, не бярэ ліха» [6, с. 40, 42]. Народная мудрасць вучыла шанаваць і паважаць бацькоў і сталых людзей, не выносіць сямейныя праблемы за парог хаты: «Не раскрывай нікому, што робіцца ў дому», «Хоць душу загубі, а з сваёй сям'і не вынасі», «Хату мяці, а шуму вон не вынасі» [6, с. 4344].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сакральныя адносіны да продкаў, уяўленне пра тое, што павага да іх ёсць умова дабрабыту сям'і і грамадства, накладвала адбітак на адносіны да старых людзей. Яны часцей за ўсе з'яўляліся галоўнымі аўтарытэтамі ў рэлігійнай і абрадавай традыцыі, захавальнікамі фальклору і гістарычных ведаў. Стэрэатыпны воблік стерэйшага пакаленны ўвасоблены ў вобразе мудрага старца, які дае парады. У шматлікіх фальклорных творах менавіта яны дапамагалі аднавіць справядлівасць, пераадолець ўсе перашкоды.

Яшчэ адна спецыфічная рыса беларускай самасвядомасці – глыбіннае пачуццё сваёй асабістай «малой радзімы», якая вельмі часта атаясамлівалася з роднай хатай і сялянскім надзелам, дзе на працягу стагоддзяў працавалі продкі і будуць працаваць нашчадкі: «Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка», «Дурная птушка сваё гняздо не шануе», «З'ехаў на чужыну, як зваліўся ў дамавіну» [4, с. 287, 289, 291]. Асветленая традыцыяй «малая радзіма» уяўляла сабою своеасаблівае генеалагічнае дрэва сялянскай сям'і, якая такім чынам ўваходзіла ў прастору і час свайго роду.

Фальклорная традыцыя ўвасобіла ў сваіх творах традыцыйную сістэму каштоўнасцей, правілы жыцця і паводзінаў, светапоглядныя арыентыры, праз якія і выяўляецца этнічная самасвядомасць. Таму захаванне, аднаўленне вывучэнне традыцыйнай народнай культуры – галоўная ўмова адраджэння самасвядомасці этнасу і гарант яго жыцця ў будучым.

**Спіс літаратуры:**


1. Агапкина, Т. А. Мифопоэтические основы славянского календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.
2. Белова, О. В. Земля / О. В. Белова, Л. Н. Виноградова, А. Л. Топорков // Славянские древности : этнолингвист. Словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – Т. 2 : Д – К (Крошки) – М. : Междунар. отношения, 1999. – С. 315–321.
3. Нечуй-Левицький, І. Світогляд українського народу. Ескіз української міфології / І. Нечуй-Левицький. – 2-е вид. – Київ : Обереги, 2003. – 144 с.
4. Панарин, А. С. Православная цивилизация в глобальном мире / А. С. Панарин. – М. : Алгоритм, 2002. – 496 с. ; Панарин, А. С. Православная цивилизация в глобальном мире / А. С. Панарин. – М. : Алгоритм, 2002. – 496 с.
5. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.
6. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ